# ШТОДЗЁННАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА У II ПАЛОВЕ XVII – XVIII СТСТ. У КАНТЭКСЦЕ КАНФЕСІЙНЫХ АДНОСІН
# THE EVERYDAY LIFE OF THE BELARUSIAN CITY IN THE SECOND HALF OF THE XVII – XVIII CENTURIES IN THE CONTEXT OF CONFESSIONAL RELATIONS

Наталля Поляк,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: горад, жыццё гараджан, рэлігія, беларускія землі, канфесійныя адносіны, праваслаўныя, пратэстанты, Магілёў, Слуцк.

Рэзюмэ. У артыкуле распавядаецца пра ролю міжканфесійных адносін у жыцці гарадскога насельніцтва беларускіх гарадоў. Вылучаюцца тыя гарады, якія ў сілу перавагі жыхароў той ці іншай канфесіі, апынуліся ў эпіцэнтры палітычнага, грамадскага і культурнага жыцця.

Keywords: city, life of citizens, religion, Belarusian lands, confessional relations, Orthodox, Protestants, Mogilev, Slutsk.

Summary. The article describes the role of interfaith relations in the life of the urban population of Belarusian cities. Those cities are distinguished which, due to the predominance of residents of a particular denomination, find themselves at the epicenter of political, social and cultural life.

Дастаткова апраўданай сёння з’яўляецца асобная ўвага даследчыкаў да гісторыі горада. Штодзённасць граджан мела сваю адметасць і своеасаблівасць. Звычайна ў горадзе асноўныя гаспадарчыя заняткі людзей мала чым адрозніваліся ад заняткаў у сельскай мясцовасці, але ж гарадское жыццё было іншым. Горад быў тым месцам, дзе знаходзіліся адміністрацыйныя, культавыя збудаванні, збіраліся кірмашы, працавалі крамы, жылі заможныя і ўплывовыя свецкія і духоўныя грамадска-палітычныя дзеячы. Нормай беларускіх гарадоў было знаходжанне побач храмаў каталіцкай, праваслаўнай, уніяцкай і пратэстанскай канфесій. Часам нават мусульманская мячэць і іўдзейская сінагога стаялі недалёка. Кожны быў уцягнуты ў міжканфесійныя адносіны таму, што пазаверавызнаўчы стан не дазваляўся і не прадугледжваўся. Паўсядзённае жыццё беларускіх гараджан магло ажыццяўляцца толькі ў кантэксце рэлігійнага жыцця.

Найбольш бурлівым жыццё беларускіх гарадоў было там, дзе размяшчаліся моцныя рэлігійныя асяродкі (храмы, школы, манастыры, брацтв) . Там дзе прыходзілася суіснаваць і кантактаваць праваслаўным з уніятамі і каталікамі, каталікам з пратэстантамі, пратэстантам з праваслаўнымі. На беларускіх землях часоў Рэчы Паспалітай такіх гарадоў было не мала таму, што супрацьстаянне каталікоў з некаталікамі ў II палове XVII –XVIII стст. вызначала ўсю ўнутранную палітыку.

Не будзе перабольшваннем сказаць, што гарады на землях сучаснай Беларусі і на яе этнічных абшарах у вызначаны прамежак часу стваралі “адзіны праваслаўны бастыён” у ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Пасля падпарадкавання Кіеўскай мітраполіі маскоўскаму патрыярху і пераходу ўкраінскіх праваслаўных епархій – Львоўскай, Пярэмышльскай і Луцкай – на

унію (канец XVII ст. – пачатак XVIII ст.) этнічныя беларускія землі засталіся адзіным і апошнім у Рэчы Паспалітай праваслаўным рэгіёнам. Тут знаходзіліся прыходы Беларускай епархіі з цэнтрам у Магілёве, а таксама буйныя манастыры і цэрквы Вільні, Беластока і іх ваколіц, Мінска, Слуцка, Пінска, Драгічына, Оршы, падначаленыя кіеўскаму мітрапаліту.

Горад Магілёў становіцца цэнтрам праваслаўнага жыцця ўсёй краіны. Вакол Магілёўскай кафедры з канца XVII ст. да сярэдзіны XVIII ст. разгарнулася зацятая барацьба, удзел у якой прымалі прадстаўнікі іншых канфесій (католікі і ўніяты), мясцовыя і замежныя духоўныя асобы, свецкія айчынныя і іншаземныя ўлады. Як пазначаюць даследчыкі той эпохі светапогляд людзей той пары мог быць толькі рэлігійны. І ўсе падзеі гарадскога жыцця трактаваліся толькі з пункту гледжання “Божай ласкі”, або “ волі Усявышняга”, “пакарання за непаслухмянасць”.

Аб пашырэнні свайго ўплыву ў горадзе дбалі ўніяты, якія пераводзілі на ўнію праваслаўных вернікаў. З гэтай нагоды неаднойчы звярталіся яны да ўлад з патрабаваннем перадаць ім магілёўскую царкву Усяміласцівага Спаса, і змяніць кіраўніцтва епархіі. Актывізацыя дзейнасці ўніятаў у горадзе ўзмацнілася ва ўмовах Паўночнай вайны. Ваенныя ліхалецці садзейнічалі таму, што жыццё гараджан увесь час хтосці намагаўся перайначыць.

У Магілёўскай хроніцы досыць падрабязна аўтары, праваслаўныя па веравызнанню ,апісваюць ўзаемаадносіны гараджан з уніятамі. Паўстае там сюжэт з Пятром І ва ўніцкім храме, дзе па яго загадзе забілі на смерць 5 уніятаў. Але з дакумента вынікае, што праваслаўныя магілёўцы спачувалі сваім суайчыннікам, ды і ўвесь гарад паводле аўтараў “ w wielkim zostawało niebespieczęstwie i w strachu” [7, с. 175].

Гарадское жыццё было ўзрушана, калі ўніверсал караля Рэчы Паспалітай ад 1705 г. зацвярдзіў на кіраўніцтва Магілёўскай епархіяй Сільвестра Чацьвярцінскага (1707 – 1729). Ён, нават, набыў тытул “епіскапа ўсёй Белай Русі, мсціслаўскага, аршанскага, магілёўскага і намесніка мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага” [6, с.81]. Такі тытул больш адпавядаў амбіцыям біскупа, чым сапраўднай яго ўладзе над праваслаўнымі. Пад юрысдыкцыю Чацвярцінскага падпадалі магілёўска-мсціслаўскія прыходы, астатнія знаходзіліся пад уладай кіеўскага мітрапаліта. А ў студзені 1710 г. на адрас маскоўскага цара Пятра І ад егуменаў Куцеенскага, Буйніцкага і Мсціслаўскага праваслаўных манастыроў прыйшла чалабітная з просьбай абараніць іх ад беларускага епіскапа С. Чацвярцінскага [8, с. 44].

Горад Магілёў, не толькі афіцыйна выступаў апошнім бастыёнам праваслаўя ў дзяржаве, але і на справе ў пабытовым жыцці, як сведчаць крыніцы, гараджане з’яўляліся заўзятымі абаронцамі сваёй веры. Садзенічалі гэтаму і памкненні імператара суседняй краіны Пятра І, якія ў горад для заступніцтва за веру з 1710 г. накіроўваў сваіх камісараў стольніка Багуслава Шыпнеўскага, Ігната Рудакоўскага і інш. Такая сітуацыя садзейнічала шчыльным камунікацыям з іншымі праваслаўнымі, якія пражывалі ў Слуцку, Пінску, Драгічына, Оршы, хаця гэтыя адносіны незаўжды былі добразычлівымі.

Новыя старонкі жыцця гараджан, раскрывае нам гісторыя Слуцка, Койданава, Копыля, Навагрудка, і інш. Менавіта яны адыгрывалі значную ролю ў супраціўленні пратэстантаў нападкам каталікаў. Як адзначаюць даследчыкі гэтыя гарады з'яўляліся буйнейшымі рэлігійнымі і культурна-асветніцкімі цэнтрамі беларуска-літоўскага кальвінізму [2, с. 230].

Істотнае значэнне для кальвіністкіх гараджан мелі апошнія прадстаўнікі біржанскай галіны роду Радзівілаў. Магнаты фінансавалі будаўніцтва і рэмонт збораў, школ, шпіталяў у Слоніме, Слуцку, Кейданах [3, арк. 21]. Пасля смерці Януша і Багуслава Радзівілаў функцыі абаронцы пратэстантаў Літвы, Жмудзі, Белай Русі і Палесся (Слуцк, Копыль, Койданава, Навагрудак, Біржы, Заблудаў і інш.) перайшлі да дачкі Багуслава Караліны. Людвіка Караліна Радзівіл дапамагала наладжваць кантакты з уплывовымі ў ВКЛ і ў Рэчы Паспалітай асобамі пратэстанцкага веравызнання, з замежнымі прадстаўнікамі, фінансавала адкрыццё храмаў, адукацыйна-асветніцкіх установ, шпіталяў. Пасля смерці Людвікі Караліны, апякунства гэтымі землямі ўзяў на сябе другі муж Радзівілавай нойбургскі князь Карл Філіп. Ён, ужо як рэйнскі электар (паўднёвы захад Германіі), арганізоўваў кіраўніцтва гарадскім жыццём ва ўладаннях жонкі, якія атрымалі назву "нойбургскія землі" [5, с. 18].

Актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны прымалі прадстаўнікі слынных пратэстантскіх родаў – жыхары Слуцка, Койданава, Ліды Навагрудка. Яны арганізоўвалі сустрэчы, складалі звароты і ўніверсалы да сваіх замежных заступнікаў аднаверных манархаў. Так, у 1704 г. шведскі кароль Карл XII у саюзнай дамове са Станіславам Ляшчынскім адгукнуўся на прашэнні гараджан пратэстантаў. У 1705 г. скаргі на прыгнёт за веру і прашэнні аб дапамозе прускаму манарху Фрыдрыха I склалі беларускія пратэстанскія шляхцічы [1, с. 250]. Заяўлялі аб сабе гараджане Слуцка, Навагрудка, Койданава пад час працы вальных соймаў у 1717, 1720, 1724 гг.

На сойм 1724 г. пратэстанты Літоўскай правінцыі дэлегіравалі навагрудскага падстолія Яна Ваўка Ланеўскага і гродненскага падчашага Яна Стрыенскага. Паслы прадставілі сойму дакумент з 49 параграфаў-патрабаванняў аб забеспячэнні прававой, эканамічнай і рэлігійнай роўнасці. "(пратэстантам) забаранялася, – гаварыў гэты дакумент, – хаваць нябожчыкаў без дазволу мясцовага ксяндза, духавенства іх (кальвіністаў. – Н.П.) не можа з хаты галавы высунуць, бо трапіць на знявагу або нават на небяспеку для жыцця... школы зачыняюць і не дазваляюць трымаць хатніх настаўнікаў, каб дзеці ішлі да іх (каталіцкіх. – Н.П.) школ, нападаюць на бязвінных дысідэнтаў асабліва ў гарадах; не так даўно езуіты напалі на хату каменданта горада Слуцка, забралі адтуль двух дысідэнцкіх вучняў і завялі ў свой калегіум, там збілі..." [4, с. 356]. Толькі выказванні паслоў амаль не браліся пад улік соймам.

З прыведзенага вынікае, што гарадское жыццё гэта і ёсць жыццё дзяржавы. Горад сам па сабе адыгрываў вялікую ролю, асабліва калі ён быў у цэнтры міжканфесійных адносін. Яго інфраструктура, месцазнаходжанне садзейнічалі ўключэнню яго ў грамадска-палітычныя справы. Горад быў тым

месцам, дзе размяшчаліся адміністрацыйныя і культавыя збудаванні ўсіх канфесій, у тым ліку і нехрысціянскіх. У горадзе жылі і працавалі актыўныя свецкія і духоўныя грамадска-палітычныя дзеячы, якія адстойвалі правы сваіх аднаверных. Кожны быў уцягнуты ў міжканфесійныя адносіны таму, што асаблівасцю дадзенай эпохі была еднасць жыцця пабытовага і рэлігійнага, пазаверавызнаўчы стан не дазваляўся і не прадугледжваўся. З прыведзеных крыніц, вынікае, што гараджане-дысідэнты ведалі заканадаўча-прававыя аспекты дысідэнцкага пытання, знешне – і ўнутрыпалітычную сітуацыю. Толькі жыццё ў горадзе садзейнічала высокай сацыяльнай мабільнасці, пашырала магчымасці ўсталявання камунікацый, дазваляла атрымліваць адукацыю, займацца грамадска-палітычнымі справамі і рашаць злабадзёныя праблемы.

Літаратура


1. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. – Вильня: Изд. О.В. Щербицкого, 1870. – Т. 8. – 468 с.
2. Augustyniak U. Testamenty ewangelików reformowanych w WKL. – Warszawa: Semper, 1992. – 249 s.
3. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (AGAD), Архіў Радзівілаў, Фонд VIII, Акты, якія тычацца духавенства, Спр. 710.
4. Łukaszewicz J. Dzieje kościołów wyznania helweckiego w Litwe. – Poznań: Druk. Orędownika na Garbarach, 1842. – T.1–2. – 414 s.
5. Мацук А.У. Радзівілы і справа аб “нойбургскіх уладаннях” (1730–1740-я гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. Сер. гуманітар. навук.–2005. – № 3. – С. 15–21.
6. Miranowicz A. Diecezja białoruska w latach 1697-1772.// Białoruskie Zeszyty Historyczne. Białystok, 2003. №19, s. 77-96.
7. Нетбаева Т. Чалавек і гісторыя ў беларускіх мясцовых хроніках XVII-XVIII стст./ Таццяна Нетбаева. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 280 с. 175 с. ) ]
8. Памятники православия и русской народности в Западной России в XVII-XVIII вв. Т.1., Ч.1., / Под ред. Титова Ф.И. Киев, 1905.